## Литература

1. *Адичи, Ч. Н.* Американха / Ч. Н. Адичи. – М. : Фантом Пресс, 2018. – 640 с.
2. *Стулов, Ю. В.* Новые тенденции в американской литературе, новые имена / Ю. В. Стулов // Вестн. БГПУ им. М. Акмуллы. – 2020. – № 4 (57). – С. 150–155.
3. *Шнирельман, В. А.* Порог толерантности. Идеология и практика нового расизма [Электронный ресурс] / В. А. Шнирельман. – Режим доступа: https://www.klex.ru/12ve. – Дата доступа: 10.08.2022.


*В. Ю. Гронская (Беларусь)*

# ВОБРАЗЫ «ЧЫСТЫХ» ПТУШАК У ПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ Л. ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

У сучасным літаратуразнаўстве назіраецца тэндэнцыя выкарыстання алегарычнага суаднясення чалавека і жывёлы. Гаворачы пра мастацкае ўвасабленне анімалістычных вобразаў, даследчыкі адзначаюць «прывязанасць» да фальклору, літаратурна-кніжных традыцый, творчае засваенне вопыту сусветнай культуры [4, с. 3]. У беларускай літаратуры жывёльны свет выконвае важную эстэтычную функцыю. Асаблівае месца сярод іх займаюць арніталагічныя вобразы, якія ў творчасці Л. Дранько-Майсюка шырока прастаўлены.

Арніталагічныя вобразы ў паэтычнай творчасці пісьменніка выкарыстоўваюцца дзеля сімвалізацыі пачуццяў, светаадчування аўтара. Так, у вершы «Каханка» адным з цэнтральных вобразаў-сімвалаў стала ластаўка. Традацыйна для вобраза птушкі характэрна аднесенасць да «чыстых» птушак, звязаных з верхам і небам, а таксама жаночая сімволіка: *«Яна была апранута ў змярканне, / І ластаўка сядзела на плячы, / На кожным крыльцы – залатое ззянне»* [2, с. 44]. Але ў прыведзеным вершы раскрываецца амбівалентная сімволіка. У традыцыйнай мадэлі свету палешукоў ластаўцы прыпісваюцца хтанічныя рысы. Так, шырока распаўсюджаны павер’і аб зімаванні ластавак у гразі, вадзе (рэчках, на дне азёр, у калодзежах і сажалках), дзе птушкі счапляюцца лапкамі ці крыламі ў ланцужкі. Вобраз ластаўкі ў такіх кантэкстах карэлюе з другім членам семантычнай апазіцыі «верх / ніз» (дзе верх – неба, а ніз – зямля, зямная і падземная вада), што яшчэ раз сведчыць аб хтанічнай прыродзе гэтай птушкі ў традыцыйнай міфалагічнай мадэлі свету [1, с. 342]. Дзеля падкрэслення амбівалентнасці птушкі і акцэнтавання ўвагі менавіта на гэтых рысах у вершы ўжываецца залаты колер «на кожным крыльцы залатое ззянне», які традыцыйным мысленнем асацыюецца «і з нябесным, і з падземным агнём, і з іншасветам, і з сонечным святлом, візуалізуе сакральнасць, маркіруе прадстаўнікоў вышэйшай нябеснай іерархіі» [5, с. 189]. Амбівалентная сімволіка ластаўкі дазваляе аўтару паэтычнага тэксту асацыятыўна звязаць яе з галоўнай

гераіняй, якая, з аднаго боку, даруе «Магчымасць <…> / Спазнаць неверагоднае каханне» [2, с. 44], а з другога боку, каханне гэтае безэмацыйнае, халоднае: *«Але цвярозасць хітрая: «Пастой, / – Сказала мне, – ты бачыш толькі цела, / А дзе душа? Душы няма! Скалела!»* [2, с. 44].

У вершы «Вядома ж, не... Мне гэта ўсё здалося!» актуалізуецца жаночая сімволіка ластаўкі: *«І ластаўку, якую сочыць ястраб, / Забраць адсюль у Грэцыю з сабой...»* [2, с. 86]. Звернем увагу і на той факт, што ў прыведзеных радках ястрабу прыпісваецца мужчынская сімволіка, а аднесенасць яго традыцыйнай свядомасцю да «нячыстых» птушак дае падставу меркаваць, што лірычны герой выратоўвае жанчыну, якую сімвалізуе ластаўка, ад катавання.

Яшчэ адным частотным вобразам у паэтычнай творчасці Л. Дранько-Майсюка з'яўляецца салавей, які ў традыцыйнай культуры славян трактуецца як боскае стварэнне, мае мужчынскую сімволіку, а таксама прыгожа спявае. Гэта акалічнасць часта абыгрываецца ў вершах пісьменніка: *«Пакуль хаваў я галаву сваю / У жоўты куст тваёй сукенкі, – / Ты развязала горла салаўю, / Туман паклала на каленкі»* [2, с. 92]. У наступным паэтычным тэксце спеў салаўя асацыятыўна звязваецца з воляй, радзімай: *«Што ні было – усё ж радзіма, / І што ні ёсць – усё ж свая, / Часцей з сабачымі вачыма, / Чым з вольным горлам салаўя. / Радней няма, бліжэй таксама»* [3, с. 128]; *«Турботы – заўтра, а сягоння / Ты – бясклапотны салавей»* [3, с. 138].

Вобраз салаўя ў фальклоры Берасцейшчыны чайсцей за ўсё сустракаецца ў лірычных песнях, у паэзіі, прысвечанай тэме кахання. Так, у вершы «Вяртанне адбываецца паволі…» выкарыстоўваецца такая мастацкая дэталь, як «прыручэнне салаўя», якую можна трактаваць як набыццё лірычным героем жаданага кахання: *«Як трубадур дзеля цудоўнай донны, / Я для цябе прыручваў салаўёў»* [2, с. 180].

Народная свядомасць асаблівую ўвагу надавала «магіі першага», з семантычнымі апазіцыямі тыпу доля / нядоля (радасць / смутак): *«Я чуў салоўку зблізку, / Я дзякаваў вясне, / Што прылятала пліска / На ганак да мяне»* [3, с. 35]. Тут, як і ў народных уяўленнях, першыя салаўіныя спевы звязваюцца з радасцю. Лірычны герой у прыведзеным вершы мае ўзнёслы настрой, а прыход вясны дазваляе меркаваць, што ў яго жыцці пачынаецца новы этап.

У традыцыйнай культуры салавей і голуб маюць падобную сімволіку. Так, у вершы Л. Дранько-Майсюка «Шольсія» актуалізуецца мужчынская сімволіка птушкі: дзікі голуб сімвалізуе сына. Адметным з'яўляецца і той факт, што антаганістам выступае «каршак», які традыцыйным мысленнем адносіцца да «нячыстых» птушак: *«У правай матчынай руцэ / Хвост надзімае дзікі голуб. / А ў левай коршак малады / Пагрозна шыю выгінае... / Пяро зляцела да грады – / Чыё яно? / Ніхто не знае. / Дурненькі коршак малады / І дзікі голуб дурнаваты, / Два ворагі і два браты, / Якой чакаеце вы раты? / Вас маці выпусціць. / Пасля – / Па тым, чыё пяро, / Спазнае, / Што у сыну больш: / Дабра ці зла? / І слёзы ў шольсію схавае»* [3, с. 88].

У народнай культуры ёсць тэксты, у якіх інфармацыя пра сусвет закадавана праз сон і тут жа адбываецца дэкадаванне. Па такой жа схеме будуецца і паэтычны твор «Галубок». Тут птушка сімвалізуе маладога рэкрута, якога «праводзяць у жальбе», але *«дасць голуб раптоўны табе / На час развітання палёгку»* [3, с. 100]. Голуб як сімвал спакою сустракаецца і ў вершы «У стомленасці ёсць

таваё імя», дзе лірычны герой знаходзіць спакой побач са сваёю каханай: *«У той лагодзе я знайшоў яе – / Хвіліну галубінага спакою. / Мая душа не плача, а пяе, / Бо стомлена не лёсам, а табою»* [2, с. 142].

Радзей у паэтычнай творчасці Л. Дранько-Майсюка сустракаюцца вобразы бусла і арла. У вершы «Краявід» актуалізуюцца ўяўленні пра паходжанне бусла ад чалавека, што дазваляе народнай свядомасці берасцейцаў прыпісваць яму некаторыя чалавечыя якасці: фізічныя, псіхічныя, маральныя, сацыяльныя: *«Каля нашага плота рака. / Абсыпаецца бераг паціху. / Грукат ранішняга цягніка / Настрахаў на бярозе буслiху. / Час такі – трэба дом пакідаць. / Не ўратуе бярозу карэнне, / Бо не надта глыбока, відаць, / Дол свідруе ці стомлена дрэмле. <…> Вось бусліха ўзляціць да нябёс! / Паглядзім і ў купэ сваё пойдзем»* [3, с. 101]. Паводле народных уяўленняў берасцейцаў, бусел надзелены пасрэдніцкай функцыяй, ён становіцца вешчуном (ці падацелем) сямейнага дабрабыту, што і знайшло адлюстраванне ў вершы Л. Дранько-Майсюка «Маленства»: *«Вось яна, ява – ахоўца нябёс / Крылы суцішыў ля нашае хаты»* [3, с. 57].

Для арла ў паэтычнай творчасці Л. Дранько-Майсюка характэрны традыцыйныя канатацыі. Так, у вершы «Ступка» намі прасочваецца адсылка да старажытнага павер'я аб тым, як Бог наслаў на арла праклён за нявыкананую працу, а на самой справе птушка выканала даручэнне, але была абгавораная сарокай ці лісой, але праклён на ёй так і застаўся: *«Дух палявання грэе ступку / І прыдумка лясная, як / Арол – распуснік і лайдак – / Сініцу песціў і галубку»* [3, с. 85]. Таксама аўтар звяртаецца ў сваіх творах і да грэчаскай міфалогіі: *«Вядомае: «Стамляецца метал... / Святло стамляецца, і Апалон стамляецца, / Арлы стамляюцца, вартуючы амфал, / А хараство ніколі не стамляецца»«* [3, с. 131]. Асаблівае месца ў творчасці Л. Дранько-Майсюка займаюць вершы на ваенную тэматыку, у адным з іх арол сімвалізуе Германію: *«З арлом – штандар амарантовы!.. / Ксяндзы адбухаюць імшу. / Каб той арол аднагаловы / Глядзеў у кожную душу»* [3, с. 140].

У заключэнне адзначым, што самымі частотнымі вобразамі з ліку «чыстых» птушак у творчасці Л. Дранько-Майсюка з'яўляюцца ластаўка, салавей і голуб, для якіх характэрны традыцыйныя канатацыі. Для ластаўкі ў паэтычных тэкстах пісьменніка характэрна амбівалентнасць, а таксама жаночая сімволіка; для голуба і салаўя, як і ў традыцыйнай культуры, характэрна мужчынская сімволіка. Таксама аўтар раскрывае ў вершах сувязь салаўя з «магіяй першага». Радзей у вершах Л. Дранько-Майсюка сустракаюцца вобразы бусла і арла. Так, у вершаваных творах для бусла характэрна вяшчунская функцыя, а арол звязваецца з міфалогіяй і павер'ямі.

## Літаратура


1. *Гронская, В. Ю.* Да пытання міфапаэтычных уяўленняў беларусаў пра ластаўку / В. Ю. Гронская // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 20–21 ліст. 2014 г. ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 342–343.
2. *Дранько-Майсюк, Л.* Вершы. Каханне. Проза : выбранае / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : ТАА «Харсвет», 2003. – 304 с.

3. *Дранько-Майсюк, Л.* Гаспода : выбранае / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 382 с.
4. *Дуктава, Л. Г.* Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст. : манаграфія / Л. Г. Дуктава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 184 с.
5. *Швед, І. А.* Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ, 2011. – 291 с.

*А. С. Гурская (Беларусь)*

# ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС І ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ЯК ПРАДМЕТ ПЕРААСЭНСАВАННЯ І РЭФЛЕКСІІ Ў КНІЗЕ АЛЕГА ЛОЙКІ «ГАЛГОФА»

Пра паяднанасць, сумяшчэнне ў творчай асобе Алега Антонавіча Лойкі талентаў пісьменніка і даследчыка літаратуры гаварылася шматразова і слушна, асабліва ў кнізе «Чалавек з сонечнаю ўсмешкай» (2019). Няпроста сказаць, які з гэтых талентаў больш важкі, вызначальны, паколькі і паэтычна-празаічная спадчына, і плён навуковых пошукаў А. Лойкі пазначаны (выкарыстаем тут словы М. Стральцова) «пячаткай майстра», абедзве сферы яго духоўнай дзейнасці – мастацкая і даследчая – аднолькава, бадай, выніковыя (невыпадкова на працягу дзесяцігоддзяў ім аддадзена столькі сіл і імпэту!). І грамадская ацэнка зробленага ў абодвух выпадках высокая і, можна сказаць, роўнавялікая: член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук (1989) – так прызнаны яго заслугі перад айчынным літаратуразнаўствам, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1990) – гэтым званнем ён уганараваны за ўклад у нацыянальнае прыгожае пісьменства (пералік іншых рэгалій і ўзнагарод апускаем). Таму ўяўляецца, што ішло няспыннае ўзаемаўзбагачэнне дзвюх граняў прыроднага дару: з аднаго боку, практычнае валоданне сакрэтамі паэтычнай творчасці спрыяла больш тонкаму пранікненню ў «старонні» мастацкі свет, а з другога – праз навукова-крытычнае асэнсаванне творчых набыткаў іншых пісьменнікаў (асабліва, калі гэта пісьменнікі-класікі) выпрацоўваліся, карэкціраваліся і ўласныя эстэтычныя крытэрыі.

У якасці падмацавання сказанаму спашлёмся на аўтарытэт В. П. Рагойшы, які не адно дзесяцігоддзе ведаў А. А. Лойку «зблізку». Зрабіўшы агаворку, што «…лёс пісьменніка, які займаецца паэтычнай і крытычнай дзейнасцю адначасова», нялёгкі, знакаміты знаўца тэорыі літаратуры працягваў: «…Такое спалучэнне – «чыстага» пісьменніка і літаратуразнаўца, крытыка, калі яно толькі абумоўліваецца характарам таленту, – заўсёды дабро. Бо грамадзянская відушчасць і літаратуразнаўчая «ўзброенасць» крытыка не могуць не пазначыцца на змесце і форме яго ўласнай